3. Алексеева, Л. Е. Методика обучения профессионально-ориентированному иностранному языку / Л. Е. Алексеева. – СПб. : Филологический факультет СПбГУ, 2007. – 140 с.

**HIGH-QUALITY TEACHING OF FOREIGN LANGUAGES TO THE UNIVERSITY STUDENTS**

***Radion T. P.***
*BIP - University of Law and social information technologies*
*Minsk, Republic of Belarus*
*tania_r@tut.by*

**Abstract.** The article considers the feasibility of using the interactive learning technology to solve the problem of high-quality teaching of foreign languages to students of higher educational institutions and the relevance of the approach to applying the SMART goals strategy in learning foreign languages in the modern information society.

**Keywords**: the study; foreign language, competencies, interactive learning technology, SMART goals.

УДК 372.881

# ГІСТАРЫЧНАЯ АСОБА Ў САЦЫЯЛЬНЫХ СЕТКАХ, ЦІ МЕДЫЯАДУКАЦЫЯ XXI СТАГОДДЗЯ

***Рачкова Я. У.***
*Сянькоўшчынская сярэдняя школа Слонімскага раёна*
*Сеньковщина, Рэспубліка Беларусь*

***Рачкова І. А.***
*Сярэдняя школа № 8 г.Слоніма*
*Слонім, Рэспубліка Беларусь*
*inna.rachkova@gmail.com*

**Анатацыя.** У дадзеным артыкуле апісваецца выкарыстанне на уроках гісторыі сацыяльных сетак Instagram, Facebook, ВКонтакте для павышення матывацыі навучання, развіцця творчых здольнасцей і пазнавальнай цікавасці вучняў. На прыкладзе жыцця і дзейнасці гістрычных асоб выхоўваецца цікавасць да вывучэння гісторыі сваей краіны, пачуццё гонару і павагі да гісторыі свайго народа.

**Ключавыя словы:** сацыяльныя сеткі, гістарычная асоба, блог, інфарматыўнасць.

Са з'яўленнем і развіццём сацыяльных сетак у жыцці падлеткаў адбыліся істотныя змены. Сталі даступныя звесткі жыцця і чыннасці шмат якіх людзей. Блогасфера зрабілася адной з магутных інтэрнэт-платформаў, дзе асобныя карыстальнікі самастойна напаўняюць гэту нішу фатаздымкамі, відэа-

матэрыяламі і тэкставымі паведамленнямі. Такім чынам, сацыяльныя сеткі цалкам адлюстроўваюць жыццё грамадства і могуць на яго ўплываць. Роля сацыяльных сетак узрастае ў жыцці сучаснага чалавека ўвесь час, гэтак жа, як і павялічваецца колькасць актыўных карыстальнікаў сеткі.

Выкладаючы гісторыю ці грамадазнаўства ў школе, шмат настаўнікаў маглі заўважыць зніжаную цікавасць да вывучэння той ці іншай гістарычнай асобы. І гэта не дзіўна, бо сучасным падлеткам нецікава, што адбывалася шмат гадоў назад. Ідэалы сучасных дзяцей сканцэнтраваны на сёняшнім дні. Таму задача настаўніка палягае ў тым, каб падстроіць навучанне пад тыя ўмовы, у якіх вывучэнне прадмета пройдзе максімальна проста і зразумела для вучняў.

Сацыяльныя сеткі могуць павялічыць уцягненасць у навучанне, павысіць яго якасць, бо дзеці будуць знаходзіцца ў звычным для іх асяроддзі.

Як вядома, самыя трывалыя веды – гэта факты, адкрытыя самастойна. Таму можна прапанаваць вучням ўявіць сябе ў ролі галоўнага героя і стварыць яго асабістую старонку на любой з прапанаванных сацыяльных сетак у анлайн фармаце (Instagram, Facebook, ВКонтакте і інш.).

Вучню самастойна прыдзецца падабраць фотаздымкі профілю і вокладкі, напісать інфармацыю пра гістарычную асобу, па магчымасці дабавіць другіх сяброў, музыку, відэа і інш. Але галоўнай умовай выкарыстання такой работы з'яўляецца асацыяванне сябе з гістарычнай асобай.

Пасля стварэння профілю можна напісаць пост пра пэўную падзею. Для гэтага вучням прапануюцца ключ-падказкі ў выглядзе пытанняў, напрыклад:

- Які подпіс пра дадзенную падзею мог зрабіць галоўны герой? Ці была б там прымацавана нейкая фатаграфія?
- Хто і як мог бы каментаваць гэты пост?

Менавіта адказы на гэтыя пытанні дазволяць самастойна вывучыць жыцце і дзейнасць гістарычнай асобы.

Аднак не ўсе сацыяльныя сеткі даюць магчымасць зарэгістравацца без нумара тэлефона, тады на дапамогу настаўніку і вучню прыходзіць стварэнне сетак у афлайн фармаце. Настаўнік прапануе вучням намаляваць старонку сацыяльнай сеткі гістарычнай асобы, такім чынам вучні спачатку вывучаюць дзейнасць асобы, а потым замацоўваюць матэрыял праз творчае заданне.

Таксама магчыма прапанаваць розныя варыяцыі па выкарыстанню гатовых рабочых картак у форме акаўнтаў сацыяльных сетак гістарычных асоб. Вучань чытае матэрыял, падрыхтаваны загадзя, запаўняе старонку сацыяльнай сеткі. Такі творчы падыход да справы вельмі захапляе навучэнцаў і, канечне, матывуе іх на пошук дадатковай інфармацыі.

Але медыяадукацыя XXI стагоддзя дае магчымасць выкарыстоўваць прасторы Інтэрнэта, як альтэрнатыву стварэння старонкі сацыяльнай сеткі

вядучых платформ. У якасці прыклада можна прывецсі сэрвіс-сімулятар Facebook [1; 2, с. 90–92].

Сэрвіс-сімулятар вельмі просты: дастаткова загрузіць фота і паслядоўна ўвесці тэксты каментароў, выбраць дату перапіскі. Пасля зрабіць скрыншот старонкі. Такім чынам замест падрыхтоўкі паведамленняў і прэзентацый з біяграфіяй якой-небудзь гістарычнай асобы можна зрабіць яго старонку ў сацыяльнай сеткі (мал.1).




Вучні, аналізуючы перапіску адказваюць на пытанні:

- Хто такі Бацька Мінай?
- Дзе знаходзіўся яго партызанскі атрад?
- Чаму партызаны называлі кіраўніка атрада Бацькам?
- У чым заключаецца гора Бацькі Міная?
- Ці разумела старэйшая дачка які лёс прыгатаваны яе сям'і?
- У чым складаецца гераізм 14-гадовай Лізы?

Зразумеўшы гераізм Міная, які дазволіў забіць сваіх дзяцей, але сам не здаўся, не пакінуў свайго атрада, навучэнцы разумеюць, якім намаганнем, сілай і мужнасцю дасталася перамога ў Вялікай Айчыннай вайне. Пасля

цяжкіх выпрабаванняў партызанскія атрады Суражскай зоны зліліся ў моцную баявую сілу – у красавіку 1942 года была створана Першая Беларуская партызанская брыгада, якую ўзначаліў Мінай Піліпавіч. Разам з часткамі Чырвонай Арміі партызаны ўтрымвалі вядомыя «Суражскія вароты» – саракакіламятровы разрыў нямецкай лініі фронту. Бацька Мінай выканаў наказ дачкі – адпомсціў за смерць дзяцей. Менавіта такія прыклады і выхоўваюць сапраўдных патрыётаў і грамадзянаў сваёй краіны.

Падводзячы вынік, варта адзначыць, што задача настаўніка гісторыі XXI стагоддя палягае ў тым, каб выкарыстоўваючы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, у прыватнасці сацыяльныя сеткі Instagram, Facebook, ВКонтакте і інш., максімальна проста і зразумела для вучняў паказаць такія прыклады жыцця і дзейнасці гістрычных асоб, якія будуць садзейнічаць павышэнню якасці навучання, выхаваць пачуццё гонару і павагі да гісторыі свайго народа, выклікаць цікавасць да вывучэння гісторыі сваёй краіны.

### Спіс літаратуры

1. Он-лайн генератор статуса Facebook – [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://simitator.com/generator/facebook. – Дата доступа: 09.02.2022.
2. Медыяадукацыя на ўроках гісторыі і грамадазнаўства: дапаможнік для настаўнікаў / А. Палейка, С. Кудраўцава, Г. Давідоўская, Н. Кушнер [і інш.] ; пад рэд. Н. В. Кушнер. – Мінск, 2020. – 252 с.

## A HISTORICAL PERSON IN SOCIAL NETWORKS OR MEDIA EDUCATION OF THE XXI CENTURY

***Rachkova Y. U.***
*Secondary School of Syankovshchyna of Slonim District*
*Syankovshchyna, Republic of Belarus*

***Rachkova I. A.***
*Secondary School No. 8 of Slonim*
*Slonim, Republic of Belarus*
*inna.rachkova@gmail.com*

**Abstract.** This article describes the use of social networks Instagram, Facebook and Vkontakte at lessons of the history to increase learning motivation, develop creative abilities, and students' cognitive interest. On the example of the life and work of historical figures, an interest in studying the history of their country, a sense of honor and respect for the history of their people is brought up.

**Keywords:** social networks, historical figure, blog, informativeness.